# ПОМНІКІ АРХЕАЛОГІІ

Усе 27 помнікаў археалогіі - 3-яй катэгорыі каштоўнасці

| Назва, датаванне, фотаздымак гісторыка-культурнай каштоўнасці | Апісанне гісторыка-культурнай каштоўнасці | Адрас,<br>месца знаходжання |
|---|---|---|
| **1-6. Стаянка-2,-3,-4,-5,-6,-7 (V тыс. да н.э. – бронзавы век).**<br>**Шыфры: 213В000902 – 213В000906, 213В000144**<br> <br>  | Крывінскі тарфянік – месца цэлага шэрагу старажытных паселішчаў узростам да 6 тыс. гадоў. На яго тэрыторыі знаходзяцца помнікі археалогіі – стаянкі Асавец 2,3,4,5,6,7. Большасць з іх даследаваў у 1968 г. М.М. Чарняўскі. На паверхні ўзгорка трапляліся крамяневыя прылады працы і кераміка, а ў торфе каля паўночна-ўсходняга падножжа – рэшткі драўляных збудаванняў. Археалагічныя раскопкі вядуцца і зараз пад кіраўніцтвам Максіма Міхайлавіча Чарняўскага.<br>**Каардынаты:**<br>**Асавец -2 54,91606 29,544388**<br>**Асавец -3 54,920309 29,550032**<br>**Асавец -4 54,916153 29,554152**<br>**Асавец -5 54,919842 29,552385**<br>**Асавец -6 54,921624 29,552621**<br>**Асавец -7 54,913438 29,54548** | **в.Асавец,**<br>0,9-1,8 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, на правым беразе р. Крывінка, побач з лесам, ва ўрочышчы Брускавішча і Дражня |

| | | |
|---|---|---|
|   | | |
| **7. Камень-следавік і крыніца, якая ўшаноўваецца. Шыфр: 213В000907**    | Валун амаль круглай формы памерамі 1,46 х1,40 х 0,7 м. Крыніца размяшчаецца каля следавіка і займае невялікую плошчу. Следавік адносіцца да помнікаў тых часоў, калі панавалі язычніцкія вераванні. Ён – старажытны культавы помнік. Адбітак на камені нагадвае след чалавечай нагі і носіць назву “Божы слядок”. Каля следавіка размяшчаецца крынічка, якая ўшаноўваецца. Вада з яе лічыцца гаючай.<br>Камень-следавік і крыніца ўшаноўваюцца як культавы помнік часоў язычніцтва на тэрыторыі сучаснага Бешанковіцкага раёна.<br><br>**Каардынаты: 55,126741 29,886618** | **аг.Астроўна,**<br>0,8 км на ўсход ад аграгарадка, на левым беразе невялікай безыменнай рачулкі, якая ўпадае ў воз. Астроўна, ва ўрочышчы Божы Слядок, злева ад дарогі Н-2041 “Астроўна – Горкі” |

| | | |
|---|---|---|
| **8. Курганны могільнік-1 (2 насыпы).**<br>**Шыфр: 213В000908**<br> | Вядомы з 1873 г. Абследавалі ў 1972 г. М.М.Чарняўскі, у 1981 г. Э.М.Зайкоўскі.<br>2 насыпы размяшчаюцца ў аг.Бачэйкава на сядзібах па вул.Краўчанкі.<br>**Каардынаты: 55,014887 29,151624** | **аг.Бачэйкава**,<br>на агародзе зямельнага ўчастка па вул. Краўчанка, 3 |
| **9. Курганны могільнік-2 (2 насыпы)**<br>**Шыфр: 213В000909**<br> | Курганны могільнік-2 выяўлены і даследванны ў 2009 г. Ільюцік А.В. і Чарняўскім А. І., раскопкі не праводзіліся. Уяўляе сабой 2 насыпы акруглай формы (вышынёй 1,5 – 3 м, дыяметрам – да 12 м.).<br><br>**Каардынаты: 55,009767 29,157461** | **аг.Бачэйкава**,<br>на паўднёвы захад ад курганнага могільніка-1, на правым беразе р. Ула, 0,5 км на поўдзень ад моста, на могілках, якія размешчаны справа ад дарогі Н-2050 “Бачэйкава – Клешчына” |

| | | |
|---|---|---|
| **10. Гарадзішча Бортнікі-1. Шыфр: 213В000910**<br> | Выявіў і абследаваў у 1981 г. Э.М.Зайкоўскі.<br>Пляцоўка памерам 28х30 м., вышыня над берагам каля 6 м.З паўднёвага боку прасочаны вал вышынёй 1,2 м. і прарэзаны ўваход шырынёй 4 м.<br><br>**Каардынаты: 55,175666 29,21888** | **в.Бортнікі-1,**<br>1,4 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, у лесе (паміж азёрамі Лешна і Плацішна) |
| **11. Курган перыяду ранняга сярэднявечча, XII ст. Шыфр: 213В000147**<br> | Выявіў і абследваў у 1981 г. Э.М.Зайкоўскі. Дыяметрам 20 м., вышынёй 1,5 м.<br><br>**Каардынаты: 55,176487 29,21432** | **в.Бортнікі-1,**<br>1,1 км на паўднёвы ўсход ад вёскі |
| **12. Курганны могільнік перыяду ранняга сярэднявечча, X - XII стст. Шыфр: 213В000151**<br><br><br> | Выявіў у 1955-56 гг. Л.В. Аляксееў, абследавалі ў 1967 г. Г.В. Штыхаў, у 1972 г. М.М. Чарняўскі. 2 курганы вышынёй каля 1,7 м., дыяметрам 11-12 м.<br><br>**Каардынаты: 55,071632 29,261551** | **в.Давыдкавічы,**<br>150 м ад паўночнай ускраіны вёскі, на левым беразе р. Свячанка, ля месца яе вытоку з возера Слабадское |

| | | |
|---|---|---|
| **13. Курганны могільнік перыяду ранняга сярэднявечча, IX - XIII стст. Шыфр: 213В000154**     | Адкрыў і абследваў у 1972 г. М.М.Чарняўскі, у 1981 г. абследваў Э.М. Зайкоўскі.<br><br>**Каардынаты: 55,033878 29,158259** | **в.Жарнасекава,** 0,5 км на захад ад паўночнай ускраіны вёскі, на могілках, на правым беразе р. Ула |
| **14. Курганны могільнік. Шыфр: 213В000912**   | Адкрыў у 1955 г. Л.В.Аляксееў, абследавалі ў 1972 г. М.М.Чарняўскі, у 1981 г. Э.М.Зайкоўскі.<br><br>**Каардынаты: 55,125658 29,201416** | **в.Жданова,** 2 км на поўдзень ад вёскі, у лесе, злева ад дарогі ў в. Шапчына, на правым беразе р. Хоцінка, 0,45 км ад месца яе ўпадзення ў р. Ула, на поўнач ад вясковых могілак |

| | | |
|---|---|---|
| **15. Курганны могільнік. Шыфр: 213В000913**<br><br> | Выявіў у 1966 г. Г.В.Штыхаў, абследавалі ў 1972 г. М.М.Чарняўскі, у 1981 г. Э.М.Зайкоўскі. 30 насыпаў вышынёй 2,5-3 м, дыяметрам 12-15м.<br><br>**Каардынаты:** **55,069795 29,965751** | **в.Замашэнне**,<br>0,3 км на поўнач ад вёскі, у лесе, абапал дарогі ў бок воз. Мошна, справа ад дарогі ў в. Жыгалы, за вясковымі могілкамі (некалькі насыпаў на могілках) |
| **16. Гарадзішча. Шыфр: 213В000914**<br> | Пляцоўка выцягнута з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход, памерам 20 х 50 м. З поўдня прасочаны рэшткі вала. На пляцоўцы зафіксаваны культурны слой. Мясцовыя жыхары знаходзілі тут бітыя чарапкі і рэчы з жалеза.<br><br>**Каардынаты:** **55,058809 29,950581** | **в.Замашэнне,**<br>1,1 км на захад ад вёскі, злева ад дарогі Н-2006 “Пліса – Пясочнае”, у лесе, на левым беразе безназоўнага ручая, які ўпадае ў р. Чарнічанка |

| | | |
|---|---|---|
|  | | |
| **17. Курган, XII ст. Шыфр: 213В000155**<br> | Выявіў у 1959 г. Л.В.Аляксееў, абследавалі ў 1972 г. М.М.Чарняўскі, у 1981 г. Э.М.Зайкоўскі. Вышыня 1,5 м, дыяметр 10 м.<br><br>**Каардынаты: 55,192052  29,235855** | **в.Зарэчча,**<br>0,1 км на поўдзень ад вёскі, на левым беразе р. Ула |

| | | |
|---|---|---|
| **18. Курганны могільнік, XII ст.**<br>**Шыфр: 213В000156**<br>  | Выявіў і абследаваў у 1981 г. Э.М.Зайкоўскі. 2 насыпы, дыяметрам 10 м., вышынёй 1,5 м.<br><br>**Каардынаты: 55,186249 29,211412** | **в.Зарэчча,**<br>1,5 км на паўднёвы захад ад вёскі |
| **19. Гарадзішча жалезнага веку, V ст. да н.э. – V ст. н.э. Шыфр: 213В000157**<br> | Помнік археалогіі выявіў і абследаваў у 1959 г. Л.В. Аляксееў, у 1981 г. абследаваў Э.М. Зайкоўскі. У культурным пласце каля 1 м знойдзены фрагменты грубаляпной гладкасценнай керамікі жалезнага веку і косці жывёл.<br>Пляцоўка амаль круглай формы, памерам 40х41 м, узвышаецца над наваколлем на 9 метраў. Валы і равы адсутнічаюць.<br><br>**Каардынаты: 54,897778 29,407222** | **в.Застарынне**,<br>1,3 км на ўсход ад вёскі, на ўзгорку на левым беразе р. Свячанка (прыток р. Ула), побач з вясковымі могілкамі |

| | | |
|---|---|---|
| **20. Курганны могільнік. Шыфр: 213В000915**   | Вядомы з канца 19 ст.<br>Абследаваў у 1956 г. Л.В.Аляксееў, у 1972 г. абследаваў М.М.Чарняўскі. Уяўляе сабой 8 насыпаў акруглай формы (вышынёй 0,8 – 1,0 м, дыяметрам – да 10,0 м.).<br><br>**Каардынаты: 54,897471 29,406602** | **в.Крупеніна,**<br>1,7 км на паўднёвы захад ад вёскі, за 0,3 км на поўнач ад в. Доўгае, на паўночны захад ад дарогі М-3 “Мінск – Віцебск”, злева ад дарогі, якая адыходзіць тут у бок в. Лучкі (8 насыпаў вышынёй да 1 м, дыяметрам 9 м) |
| **21. Курган, XIII ст. Шыфр: 213В000159**  | Выявіў у 1956 г. Л.В. Аляксееў, абследавалі ў 1972 г. М.М.Чарняўскі, у 1981 г. Э.М. Зайкоўскі. Дыяметр 24 м., вышыня 3,5м.<br><br>**Каардынаты: 55,03619 29,156188** | **в.Прыгожае,**<br>0,5 км на ўсход ад паўночнага канца вёскі, за могілкамі, на левым беразе р. Ула. |

| | | |
|---|---|---|
|  | | |
| **22. Гарадзішча, VIII ст. да н.э. – IV ст. н.э. Шыфр: 213В000160**   | Помнік археалогіі абседвалі ў 1956 – 1957 гг. Л.В.Аляксееў, у 1972 г. М.М.Чарняўскі, у 1981 г. Э.М.Зайкоўскі. Знойдзены рэшткі ляпной керамікі днепра-дзвінскай культуры (8-7 стагоддзі да н. э.). Пляцоўка дыаметрам 38 м. Паўночны схіл стромкі, з поўдня прасочваюцца рэшткі рова, з усходу схілы разараны.<br><br>**Каардынаты: 54,981315 29,622611** | **в.Рубеж,**<br>0,2 км на ўсход ад вёскі і ад дарогі Р-113 “Сянно – Бешанковічы – Ушачы”, на левым беразе р. Бярозка |

| | | |
|---|---|---|
| **23. Курганны могільнік, X-XIII стст.**<br>**Шыфр: 213В000166**<br><br> | Выявіў у 1929 г. І. Карандзей, абследваў ў 1972 годзе М.М.Чарняўскі. Раскопкі не праводзіліся.<br><br>**Каардынаты: 55,225665 29,221347** | **в.Ульянаўка**,<br>0,4 км на паўднёвы захад ад вёскі, на левым беразе р. Ула, 1 км на паўднёвы захад ад моста цераз раку |
| **24. Курганны могільнік (5 насыпаў).**<br>**Шыфр: 213В000916**<br> | Адкрыў і ўпершыню абследаваў у 1956 г. Л.В.Аляксееў, 1981 г. абследаваў Э.М.Зайкоўскі. Уяўляе сабой 5 насыпаў, 4 з якіх круглай формы (вышынёй 1,8 м, дыяметрам 12 м.), 1 – доўгі (памерам 31х12х2 м.). 1 насып пашкоджаны ямамі скарбашукальнікаў. Астатнія ў здавальняючым стане.<br><br>**Каардынаты: 55,225665 29,221347** | **в.Фролкавічы**,<br>0,5 км на паўночны захад ад паўднёва-заходняй ускраіны вёскі (машынны двор), на левым беразе р. Ула, злева ад лясной грунтавой дарогі, якая адыходзіць ад дарогі Р-114 “Гарадок – Ула - Камень”, 0,1 км ад моста цераз р. Ула, у бок в. Стаі |

| | | |
|---|---|---|
|   | | |
| **25. Курган, XII ст. Шыфр: 213В000168**  | Адкрыў і абследваў у 1972 г. М.М.Чарняўскі. Вышыня 1,7 м, дыяметр 12 м.<br><br>**Каардынаты: 55,20336 29,213333** | **в.Фролкавічы**, 0,9 км на паўночны-захад ад вёскі, на левым беразе р. Ула |

| | | |
|---|---|---|
| **26. Гарадзішча. Шыфр: 213В000917**<br> | Вядома з 1964 г., абследавалі ў 1972 г. М.М. Чарняўскі, у 1981 г. Э.М. Зайкоўскі. Пляцоўка памерам 68х48 м. выцягнута з поўдня на поўнач і ўзвышаецца над падножжам на 7-10м. З паўночнага боку – роў глыбінеей 2 м. і 2 валы вышынёй 2,1-2,5 м. Цяпер на пляцоўцы могілкі.<br><br>**Каардынаты: 55,083607 29,732984** | **в.Чарнагосце**,<br>1 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, 0,9 км на захад ад в. Беркава, на правым высокім беразе р. Чарнагосніца |
| **27. Гарадзішча жалезнага веку, V ст. да н. э. – V ст. н. э. Шыфр: 213В000170**<br> | Гарадзішча вядома з 1969 г. (К.П.Шут. 1969, мал.8, № 190), абследаваў у 1972 г. Міхась Міхайлавіч Чарняўскі.<br>Уяўляе сабой насып выцягнутай формы з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход (вышынёй да 4,0 м, даўжынёй – да 40,0 м).<br><br>**Каардынаты: 55,075156  29,346402** | **в.Янаўшчына**,<br>0,5 км на поўнач ад вёскі |

| | | |
|---|---|---|
|  | | |